Голас Радзімы

№ 2 (1728)
14 студзеня 1982 г.

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ
(БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»)

Выдаецца з 1955 г.
Цана 4 кап.



Студзеньскія маразы.

Фота В. САСНОЎСКАГА.

НАМ ЖЫЦЬ НА ГЭТАЙ ЗЯМЛІ
[«Клопат дзяржаўны, клопат агульны»]
стар. 3

ПРА ТАК ЗВАНУЮ «САЦЫЯЛЬНУЮ НЯРОЎНАСЦЬ»
[«Существует ли в СССР новый класс»]
стар. 5

ВЫЙШЛА Ў СВЕТ ДВУХТОМНАЕ ВЫДАННЕ ТВОРАЎ КАНСТАНЦЫІ БУЙЛО
[«Люблю наш край...»]
стар. 6

падзеі • людзі • факты

«БЛАКІТНАЕ ПАЛІВА» — У МАГІЛЁВЕ

Блакітны факел успыхнуў у Магілёве ў гонар паспяховага завяршэння будаўніцтва газаправода Орша — Магілёў — 90-кіламетровай адводкі ад магістральнай трасы Таржок — Мінск — Івацэвічы. Будаўнікі праклалі яго ў два разы хутчэй нарматыўнага тэрміну. Новая артэрыя здольна падаваць у год да мільярда кубаметраў «блакітнага паліва». Яно ў тры разы дзешавей прывазнога звадкаванага, якім да гэтага часу забяспечваўся горад.

Першымі спажыўцамі прыроднага газу стануць жыхары самага буйнога жылога мікрараёна горада Мір-2. Сёлета ім будуць таксама забяспечаны і прамысловыя прадпрыемствы: заводы «Строммашына» і металургічны імя Мяснікова, якія працавалі раней на мазуце.

У далейшым ён будзе пададзены ва ўсе жылыя мікрараёны Магілёва і Шклова, у бліжэйшыя да трасы пасёлкі, а да канца пяцігодкі — на ўсе прадпрыемствы і ў кацельні прамысловага вузла, размешчанага ў правабярэжнай частцы Магілёва. Гэта дасць вялікую эканамічную выгаду: у трыццаць разоў скароцяцца расходы на паліва ў прамысловасці. За кошт газіфікацыі, паводле разлікаў спецыялістаў, на адзін працэнт павысіцца прадукцыйнасць працы. Спыніцца выкід шкодных рэчываў у атмасферу, на чыгуначным транспарце вызваляцца тысячы цыстэрнаў, якія дастаўлялі звадкаваны газ, мазут. А газазаправачныя машыны, якія працавалі ў горадзе, будуць накіраваны ў сельскую мясцовасць.

Працоўнай перамозе ўсіх удзельнікаў пракладкі газаправода быў прысвечаны мітынг, які адбыўся 7 студзеня ў Магілёве. Першы сакратар Магілёўскага абкома партыі В. Прышчэпчык зачытаў прывітанне Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі, Прэзідыума Вярхоўнага Савета і Савета Міністраў рэспублікі будаўнікам, мантажнікам, эксплуатацыйнікам, партыйным, прафсаюзным і камсамольскім арганізацыям, усім удзельнікам будаўніцтва газаправода Орша — Магілёў, павіншаваў іх з працоўнай перамогай.

Прыродны газ прыйшоў у Магілёў. Цяпер трэба будзе падаць яго больш чым у 110 тысяч кватэр, падключыць да ста з лішнім прамысловых прадпрыемстваў горада.

ПРЫСВОЕНА ЗВАННЕ

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ТАРАСАВУ Віктару Паўлавічу — артысту Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы за вялікія заслугі ў развіцці савецкага тэатральнага мастацтва прысвоена ганаровае званне «Народны артыст СССР».

АБРАНЫ АКАДЭМІКАМ

Прызнаннем вялікіх заслуг беларускай фізікі стала прайшоўшае напярэдадні Новага года выбранне правадзейным членам Акадэміі навук СССР прэзідэнта АН БССР, лаўрэата Ленінскай і Дзяржаўнай прэмій СССР, Героя Сацыялістычнай Працы М. Барысевіча.

М. Барысевіч стаў першым у гісторыі беларускай навукі акадэмікам АН СССР.

АБАРОНЦУ ЦЫТАДЭЛІ

У Брэсце ўстаноўлены помнік абаронцу цытадэлі над Бугам Пятру Гаўрылаву, які ў першыя дні вайны быў камандзірам 44-га стралковага палка.

На адкрыццё помніка, адлітага ў бронзе, прыйшлі ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, у тым ліку абаронцы крэпасці, піянеры дружыны імя П. Гаўрылава сярэдняй школы № 22, а таксама жыхары вуліцы, якая носіць імя героя.

Некалькі раней бюсты Пятра Міхайлавіча былі ўстаноўлены ў роднай вёсцы Альведзіна Татарскай АССР, а таксама ў экспазіцыі музея абароны Брэсцкай крэпасці. Яго іменем названа вуліца ў Краснадары, дзе жыве цяпер сям'я бясстрашнага героя.

КНІГІ ЯПОНІІ

Прадукцыя дваццаці васьмі выдавецкіх фірм прадстаўлена на выстаўцы кніг Японіі, якая адкрылася ў Мінску. У экспазіцыі, разгорнутай у Доме кнігі, дэманструецца каля тысячы выданняў грамадска-палітычнага характару, работ вядомых японскіх вучоных, даследаванняў па праблемах аховы навакольнага асяроддзя, дапаможнікаў па мастацтву японскай вышыўкі. Шырока прадстаўлена мастацкая літаратура, дзе вядучае месца займаюць кнігі для дзяцей і юнацтва.

У Японіі выклікаюць цікавасць і кнігі, якія выходзяць у Беларусі. Так, фірма «Сейдзіся» падпісала кантракт на выданне аповесці В. Быкава «Воўчая зграя», а фірма «Кікура сёбу» — кнігі А. Пашкевіча «Сацыяльна-палітычныя канцэпцыі амерыканскага менеджмента».

НАВАСЕЛЛІ ГРОДНА

Новы жылы масіў Дзевятаўка, дзе пяць шматпавярховых дамоў ўжо прынялі навасёлаў, ствараецца ў Гродна. У будынках, «апранутых» у рознакаляровую кераміку, вялікія пярэднія, кухні і лоджыі, палепшанай планіроўкі пакоі, зручныя кладоўкі. Адначасова з жыллём тут узводзяцца некалькі магазінаў, камбінат бытавога абслугоўвання, дзіцячыя сады, школа. Намечана таксама абсталяваць стаянку для прыватнага аўтатранспарту і падземныя гаражы, дзіцячы гарадок з басейнам.

Забудова мікрараёна, разлічанага больш чым на 11 тысяч жыхароў, завершыцца ў гэтай пяцігодцы. У мінулым годзе ў абласным цэнтры ўведзена 186 тысяч квадратных метраў жылля.

«ДОМ» ДЛЯ БУЛЬБЫ

Выпрабаванні дваццаціградуснымі маразамі паспяхова вытрымалі бульбяныя бурты з лёгкіх канструкцый на Самахвалавіцкім гароднінным камбінаце пад Мінскам. Пенапластавыя сцены і дах, якія напылваюцца на металічны каркас, надзейна абараняюць ад холаду. А вентыляцыйная сістэма, якая працуе па «камандзе» датчыкаў, даводзіць тэмпературу да аптымальнай. Спецыялісты Мінскага канструктарска-тэхналагічнага бюро гароднінай гаспадаркі, аўтары гэтай навінкі, лічаць, што такія тыпавыя «дамы» для бульбы можна за кароткі тэрмін пабудаваць ва ўсіх гаспадарках.

Гэта адна са шматлікіх распрацовак канструктарска-тэхналагічнага бюро — першага ў краіне, якое поўнасцю спецыялізуецца на вырашэнні праблем захоўвання гароднінны. Яго спецыялісты цесна супрацоўнічаюць з вучонымі многіх акадэмічных, навукова-даследчых і вучэбных інстытутаў.

ШТО ДАЕ АЎТАМАТЫКА

Доўгае жыццё самым дэфіцытным вузлам бульбаўборачных машын гарантуюць аўтаматычныя лініі папярочна-клінавай пракаткі, распрацаваныя вучонымі Фізіка-тэхнічнага інстытута Акадэміі навук Беларусі. Сям'я такіх комплексаў, укаранёных на Лідскім заводзе сельскагаспадарчага машынабудавання, здольна на трэць павялічыць зносаўстойлівасць дэталей. Скарацілася страты металу пры апрацоўцы, знізіўся расход электраэнергіі.

Створаныя вучонымі інстытута станы папярочна-клінавай пракаткі за год прыносяць прадпрыемству 800 тысяч рублёў эканоміі. Выпускаемыя ў Лідзе машыны паступаюць ва ўсе саюзныя рэспублікі, іх ахвотна купляюць у многіх краінах свету. У мінулым годзе вучоныя Акадэміі навук рэспублікі ўкаранілі ў народную гаспадарку краіны сотні навуковых распрацовак.



Калектыў Магілёўскай бройлернай фабрыкі павялічвае выпуск прадукцыі. Дадаткова да задання ў мінулым годзе прадпрыемства паставіла 200 тон дыетычнага мяса.

Уніфікаваны каляровы тэлевізар на інтэгральных схемах ствараецца ў Мінскім вытворчым аб'яднанні «Гарызонт». Ён будзе амаль удвая лягчэйшы за выпускаемыя цяпер апараты. Эканомія электратэхнічнай сталі, чорных і каляровых металаў на кожным тэлевізары складзе звыш 12 кілаграмаў. Спажыванне электраэнергіі зменшыцца больш чым у два разы. Першая партыя новых тэлевізараў будзе выпушчана ў канцы 1982 года.

НА ЗДЫМКАХ: група распрацоўшчыкаў новага тэлевізара; вядучы інжынер Н. ГАРНАСТАЙ і старшы тэхнік Н. ПІСКУН праектуюць мікраэлектроніку новага тэлевізара.

Фота А. ТАЛОЧКІ.

УСЯГО ЗА 10 ДЗЁН

ЖАВАЛЬНАЯ ГУМКА СУПРАЦЬ КУРЭННЯ

У апошнія гады медыкі розных краін прапанавалі мноства метадаў барацьбы з курэннем. Аднак практыка паказала: дзве трэці кінуўшых курыць праз некалькі месяцаў зноў цягнуцца да цыгарэты.

Вучоныя Беларусі прапанавалі свой, незвычайны і ў той жа час просты спосаб, які праходзіць шырокае клінічнае выпрабаванне ў 11 медыцынскіх установах Масквы, Ленінграда, Львова і Мінска. Вынікі такія: з 6 тысяч курыльшчыкаў, якія прынялі ўдзел у выпрабаванні, ні адзін пакуль не вярнуўся да згубнай прывычкі.

Сродак, які прапанавалі супрацоўнікі Беларускага навукова - даследчага санітарна - гігіенічнага інстытута, гэта... жавальная гумка светла - жоўтага колеру з апельсінавым пахам і крыху гаркаватым табачным прысмакам. У яе дабаўлена некалькі міліграмаў антынікацінавага рэчыва. Вось, уласна, і ўвесь сакрэт.

— Вядома мноства сродкаў, выклікаючых «непрыязнасць» да курэння,— гаворыць адзін з аўтараў новага прэпарата намеснік дырэктара інстытута доктар медыцынскіх навук Віталій Талапін.— Напрыклад, розныя таблеткі, парашкі. Але, калі яны пранікаюць у арганізм, на іх дарозе стаіць цяжка пераадольваемы бар'ер — печань, якая імкнецца разбурыць усе інародныя рэчывы. У гэтым, на мой погляд, якраз і караняцца прычыны іх недастатковай эфектыўнасці: дым перш за ўсё трапляе ў ротавую поласць, а таблеткі — у страўнік, прычым печань значна аслабляе іх дзеянне. Значыць, трэба альбо ствараць больш моцныя лякарствы, альбо шукаць зусім іншыя формы лекавых прэпаратаў. Мы пайшлі па іншаму шляху.

Як жа дзейнічае антынікацінавая жавальная гумка?

Па-першае, яе выкарыстанне дае магчымасць, паводле выказвання Віталія Талапіна, перанесці «змаганне са страўніка ў поласць роту», гэта значыць іменна туды, дзе адбываецца першая сустрэча нашага арганізма з табачным дымам. Лякарства, што нагадвае смак нікаціну, паступова «зжоўваецца» і, як бы змазваючы поласць роту, «падманвае» арганізм.

Па-другое, антынікацінавае рэчыва дзякуючы структурнаму падабенству з нікацінам, усмоктваючыся, разносіцца па арганізму і, уступаючы ў канкурэнтныя адносіны з нікацінам, само становіцца на яго месца. Атрымліваючы замест нікаціну яго эрзац, які ўзаемадзейнічае з тымі ж біяхімічнымі структурамі, арганізм «супакойваецца». Такім чынам удаецца вырашыць адну са складанейшых праблем — перамагчы паталагічную цягу да нікаціну. Больш таго, неўзабаве з'яўляецца агіда да паху табачнага дыму.

Па - трэцяе, — працягвае пералічэнне вартасцей гэтага прэпарату Віталій Талапін,— трэба валодаць асаблівым талентам, каб ухітрыцца жаваць і курыць адначасова, таму чалавек міжволі адмаўляецца ад цыгарэты. Ва ўсякім выпадку, калі ён сапраўды вырашыў расстацца з гэтай прывычкай.

Тэхналогія вырабу антынікацінавай гумкі простая: у якасці сыравіны для яе асновы (вельмі таннай і галоўнае — натуральнай) выкарыстоўваюць смаляныя кіслоты, што атрымліваюцца пры перапрацоўцы хвойных дрэў. Простая і арганізацыя курса лячэння. Ён разлічаны на 10 дзён, але ў залежнасці ад успрыняцця арганізма можа працягвацца і тыдзень, а часам дастаткова ўсяго 2—3 дні.

Эфектыўнасць новага метаду даказалі шырокія клінічныя даследаванні, для якіх было выраблена больш як 150 тысяч доз прэпарата. У адным з эксперыментаў ахвотна прыняў удзел і мой муж. Не ўнікаючы ў падрабязнасці, скажу: ужо праз тыдзень у нашай кватэры поўнасцю знік пах табачнага дыму.

Больш таго, дозы, разлічанай на «барацьбу» з адным курыльшчыкам, цалкам хапіла не толькі майму мужу, але і яго калегу. Цікава, што, маючы агульны трыццацігадовы стаж курэння, ні той, ні другі не толькі не верылі ў поспех эксперымента, але нават... не збіраліся кідаць курыць.

Наталля БУЛДЫК.

КЛОПАТ ДЗЯРЖАЎНЫ, КЛОПАТ АГУЛЬНЫ

М. ДУБАВЕЦ,
намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта БССР па ахове прыроды.

Неяк давялося падслухаць размову. На аўтобусным прыпынку гутарылі двое.

— Цудоўны горад Мінск,— казаў адзін з іх.— Яго плошчы, паркі, бульвары захапляюць. Але я пагадзіўся б пажыць тут толькі тыдзень-другі. Не больш...

— Чаму ж гэта? — здзіўлена перапытаў таварыш.

— Шумна вельмі ў вас тут. Ды і паветра... Не параўнаць яго з нашым, вясковым...

Гарадскі шум, праблема чысціні паветра і воднага басейна... Усё гэта так характэрна для вялікага, сучаснага горада. І што парадаксальна — без такіх вось «адметных» рыс, якія ўразілі вяскоўца, немагчыма ўявіць сабе буйны індустрыяльны цэнтр. Прамысловасць, транспарт, камунальная гаспадарка — усё гэта служыць чалавеку. І разам з тым гэты так званы жыццёва важны комплекс шкодзіць яму. Выхлапныя газы дзесяткаў тысяч машын, заводскія і фабрычныя трубы... Атмасфера літаральна перанасычана ўсемагчымымі шкоднымі злучэннямі. Мікрапрымесі, вокіслы вуглероду, азоту, серы — усё гэта адмоўна ўздзейнічае на здароўе чалавека. І калі найбольш шкодныя вытворчасці выносяцца за мяжу горада або пераходзяць на безадходную тэхналогію, то транспартныя патокі маюць рашаючы ўплыў на чысціню паветра. Дастаткова сказаць, што толькі адна малалітражка са сваімі выхлапнымі газамі больш шкодная, чым цэлая цеплавая станцыя! А колькі такіх легкавушак! Але ці не азначае ўсё гэта, што чалавек ужо бяссільны ў барацьбе з гарадскім шумам, са шкоднымі злучэннямі і г. д.?

Вядома, не. Калі падыходзіць да праблемы аховы прыроды больш творча і рацыянальна, умела выкарыстоўваючы пры гэтым дасягненні навукі і тэхнікі, то можна дабіцца прыкметных зрухаў. Аб чым сведчыць і прыклад Мінска, іншых індустрыяльных цэнтраў Беларусі. Паветраны басейн сталіцы нашай рэспублікі ў апошнія гады стаў намнога чысцейшым. Комплексныя работы па аздараўленню атмасферы горада пачаліся ў 1977 годзе і набылі такі размах, які дае падставу разлічваць на рэзкае змяншэнне выкіду шкодных рэчываў. Падзелавому рашаецца праблема газаачысткі на такіх прамысловых гігантах сталіцы рэспублікі, як аўтамабільны і трактарны заводы, а таксама разгружаюцца галоўныя аўтамагістралі, для транзітных грузавікоў будуюцца новыя аб'язныя дарогі, уздоўж вуліц, ля ажыўленых перакрыжаванняў высаджваюцца спецыяльныя пароды дрэў, здольныя паглынаць шкодныя мікрапрымесі і г. д. Мне не раз даводзілася чуць выказванне нашых замежных гасцей і асабліва тых, хто прыязджае са Злучаных Штатаў Амерыкі, Канады, дзе праблема аховы навакольнага асяроддзя буйных індустрыяльных цэнтраў — праблема з праблем, што паветра ў Мінску вельмі чыстае, дыхаецца тут лёгка і свабодна. Што ж, такое прызнанне не беспадстаўнае. На ахову навакольнага асяроддзя ў нас трацяцца немалыя грошы. І трэба сказаць, што дзяржава з затратамі не лічыцца.

З прыняццем новай Канстытуцыі БССР (1978 год) абавязкі берагчы прыроду і ахоўваць яе багацці ўпершыню набылі характар канстытуцыйнага патрабавання, якое распаўсюджваецца не толькі на барацьбу з гарадскім шумам, станоўча ўплывае на ахову паветранага і воднага басейнаў, але і ўключае шматлікія пытанні рацыянальнага размяшчэння прадукцыйных сіл, комплекснае выкарыстанне прыродных багацяў, укараненне новых тэхналагічных працэсаў вытворчасці і г. д. Меры па ахове навакольнага асяроддзя маюць не толькі вялікае эканамічнае, але і сацыяльнае значэнне, аказваючы ўплыў на ўмовы працы і быт чалавека. З аднаго боку — чыстае паветра выклікае добрае самаадчуванне, умацоўвае здароўе, а з другога — з'яўляецца важнай перадумовай для рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў у народнай гаспадарцы. Акадэмія навук БССР, галіновыя навукова - даследчыя інстытуты, вышэйшыя навучальныя ўстановы вядуць фундаментальныя распрацоўкі праблем аховы глебы, расліннага і жывёльнага свету, вады, паветра. Распрацаваны прагнозы магчымых змяненняў у біясферы ажно да 2000 года.

У Беларусі ёсць нямала прыкладаў удумлівага падыходу да аховы прыроднага асяроддзя. На мінскіх аўтамабільным і трактарным заводах, напрыклад, у апошні час праведзены значныя работы па скарачэнню спажывання вады пітной якасці. Многія прамысловыя прадпрыемствы горада практычна спынілі скід неачышчаных сцёкавых вод. І як вынік — на берагах Свіслачы з'явіліся нават рыбакі.

Эфектыўныя работы праведзены і па зніжэнню ўзроўню шуму на тэрыторыях жылых забудоў. Станоўчы ўплыў на экалагічны стан горада безумоўна зробіць і першая чарга метрапалітэна.

Нямала выдумкі і фантазіі па захаванню навакольнага асяроддзя праявілі на магілёўскім заводзе «Строммашына». Тэрыторыя прадпрыемства азяленена і ператворана ў сапраўдны квітнеючы сад. Поўнасцю спынены скід сцёкавых вод у вадаёмы, уведзена ў эксплуатацыю зваротнае і паўторнае водазабеспячэнне. Аднак, як сведчаць даныя Рэспубліканскага ўпраўлення па гідраметэаралогіі і кантролю прыроднага асяроддзя, не ўсюды праяўляюцца дзелавыя клопаты аб ахове прыроды. Значная частка шкодных выкідаў у атмасферу прыпадае на долю Наваполацкага нафтаперапрацоўчага завода і некаторых іншых прадпрыемстваў. Мы аб гэтым добра ведаем і прымаем дзейсныя меры па ўдасканаленню сістэм газаачысткі. Шмат праблем звязана і з выкарыстаннем прыродных багацяў. Прывяду такі прыклад. Для будаўніцтва прасёлачнай дарогі патрэбен гравій і пясок. Знайшлося месца, багатае на гэтыя выкапні. Тут жа распрацавалі кар'ер. Але праз год-другі ён ужо не спатрэбіўся. І вось на паверхні зямлі ўтварылася велізарная абмярцвелая мясціна. Як жа быць? Раней яна проста засталася б паза ўвагай. Цяпер жа ўсе такія кар'еры рэкультывуюцца: на значных плошчах высаджваюцца лясы, пэўныя зямельныя ўчасткі перадаюцца сельскагаспадарчай вытворчасці. Або вось такі прыклад. У рэспубліцы ёсць цудоўная курортная зона адпачынку — Браслаўскія азёры. Чыстае паветра, празрыстая вадзяная гладзь — усё гэта заклікана ствараць у чалавека выдатны настрой, спрыяць здароўю. Але да нядаўняга часу тут не ўсё было гладка з сістэмай воднага басейна. Атрымлівалася так, што нават самае дробнае прамысловае прадпрыемства, размешчанае ў зоне адпачынку, мела сваё ачышчальнае збудаванне. З аднаго боку бы і нядрэнна. А з другога? Узвядзенне кожнага такога аб'екта патрабавала не толькі дадатковых матэрыяльных затрат, але і наносіла адначасова шкоду акружаючаму асяроддзю. Узважыўшы нарэшце ўсе за і супраць, было прынята рашэнне аб выдзяленні сродкаў на будаўніцтва адзінай цэнтралізаванай біялагічнай сістэмы ачысткі сцёкавых вод. Менавіта так была вырашана праблема аховы прыроды і ў раёне возера Нарач.

Помніцца і такі выпадак. Прыехалі мы неяк у Пінскі раён, а там у адным з саўгасаў — у разгары асушэнне балот, і якраз верхавых. Адзін з маіх спадарожнікаў і запытаўся:

— А ці варта рыхтаваць іх да торфараспрацовак? Гэтыя ж балоты — своеасаблівыя акумулятары вільгаці, я б сказаў, вартавыя навакольнага асяроддзя...

Вось так было прынята потым і яшчэ адно рашэнне, але ўжо аб збяражэнні верхавых балот, большасць якіх уключана ў запаведныя гаспадаркі. Дарэчы, плошча ахоўваемых тэрыторый у рэспубліцы ўжо налічвае каля мільёна гектараў. Гэта — ландшафтныя, гідралагічныя, азёрныя, журавінныя і паляўнічыя заказнікі, заказнікі лекавай сыравіны і рэдкіх раслін. Усяго ж дзейнічаюць цяпер у нас чатыры запаведнікі і запаведна - паляўнічыя гаспадаркі, 59 дзяржаўных заказнікаў. Паспяхова завершана ў рэспубліцы і будаўніцтва дзевяці буйных воднагаспадарчых комплексаў і вадасховішчаў агульнай плошчай каля 50 тысяч гектараў. На ўсіх гэтых аб'ектах створаны выдатныя зоны адпачынку, адведзены месцы для рыбнай лоўлі.

Ахова навакольнага асяроддзя — адно з важнейшых пытанняў нашага жыцця. І яно патрабуе сумесных намаганняў, міжнароднага супрацоўніцтва і каардынацыі дзейнасці ўсіх краін і народаў свету. Пры наяўнасці добрай волі, пры разумным падыходзе да справы гэта праблема можа і павінна быць вырашана.

Наша рэспубліка таксама ўносіць пэўны ўклад у дзейнасць міжнародных арганізацый у галіне аховы прыроды. Яна з'яўляецца актыўным членам Савета Кіруючых праграмы Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па праблемах навакольнага асяроддзя. Двухбаковыя сустрэчы і пагадненні праводзяцца з шэрагам краін сацыялістычнай садружнасці. Беларуская ССР пастаянна ўдзельнічае ў рабоце сесій старэйшых саветнікаў краін па ахове навакольнага асяроддзя Еўрапейскай Эканамічнай камісіі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

пісьмы зблізку

НА РОДНАЙ ЗЯМЛІ

Старшыню калгаснікі выбіраюць на сходзе. Адпрацаваў два гады, калі ласка, трымай справаздачу—што зрабіў, як гаспадарыў. Умела вядзеш справу—у добры час яшчэ на тэрмін. Не спраўляешся з работай—уступі месца іншаму... Колькі вось такіх справаздач было за тры дзесяцігоддзі на пасадзе старшыні ў Сяргея Палешчука! І кожны раз калгаснікі зноў і зноў давяралі яму ўзначальваць калектыўную гаспадарку, бо ён апраўдваў іх спадзяванні і надзеі.

З гадамі калгас імя Калініна, што на Случчыне, эканамічна мацнеў, развіваўся, багацеў. На змену цяглавай сіле прыходзілі новыя сельскагаспадарчыя машыны і трактары, адбудоўваліся вёскі... Зазірніце цяпер у дом любога калгасніка. У пакоях чыста, светла, утульна. Ля кожнага дома ёсць прысядзібны ўчастак, агарод, свая ўласная дапаможная гаспадарка. І дом Палешчука нічым не адрозніваецца ад іншых у вёсцы. Такі ж дыхтоўны, дагледжаны. Неяк прыязджаў у Мялешкі (цэнтральная сядзіба калгаса імя Калініна Слуцкага раёна) з Амерыкі ў госці да Палешчука яго дваюрадны брат, бацька якога яшчэ да рэвалюцыі падаўся ў Новы свет на пошукі лепшага жыцця. І ўсё здзіўляўся госць: маўляў, як гэта ў такога «багатага фермера» (гэта значыць Палешчука) зусім звычайная сялянская хата, ды і без прыслугі яшчэ.

— А навошта?—у сваю чаргу не разумеў сваяка Паляшчук.—Ці ж я без рук, без ног? Я селянін, навошта мне палацы? Добра і на бацькоўскай сядзібе. Сам вось упраўляюся па гаспадарцы... Што ж датычыцца прыслугі, дык наша рэвалюцыя даўным-даўно адмяніла ўсялякае прыслужванне...

Зразумеў тады госць з-за акіяна Палешчука, пераканаўся, што мялешкінцы жывуць у дастатку, заможна. Ён добра памятаў расказ бацькі пра курныя хаткі з падслепаватымі вокнамі, пра горкую і няшчасную долю тых, каго ён пакінуў, скіраваўшы свой шлях у Амерыку... Нічога такога сваяк Палешчука не ўбачыў. Хіба толькі ў калгасным музеі мог паглядзець некаторыя экспанаты, якія напамінаюць аб былым... Мялешкінскі музей размешчаны ў Палацы культуры. Тут заўсёды мнагалюдна, бо вельмі цікава пазнаёміцца з бытам дзядоў-прадзедаў сённяшніх сялян—вядомых на ўвесь раён мялешкінскіх людзей...

Ёсць у музеі і саха—у недалёкім мінулым вечная спадарожніца селяніна,—і лучыны, хатка з маленькімі акенцамі... Другі раздзел расказвае аб воінах і партызанах, жыхарах вёскі, якія не вярнуліся з франтоў Вялікай Айчыннай вайны... 130 чалавек аддалі свае жыцці за свабоду! Сярод іх—чатыры браты Сяргея Палешчука. І сам ён ваяваў на фронце. Праз усю вайну прайшоў танкістам. Абараняў Маскву, удзельнічаў у шматлікіх баях з гітлераўцамі. А Дзень Перамогі сустрэў у Берліне... Вярнуўся толькі ў 1947 годзе. Цяжкія раны давалі аб сабе знаць. Працаваў спачатку лесніком, потым—у сельсавеце. А калі дробныя калгасы, што былі амаль у кожнай вёсцы, пачалі аб'ядноўвацца і на чале іх станавіліся людзі з вялікім арганізатарскім талентам, самаадданыя, апантаныя ідэяй убачыць калектыўную гаспадарку багатай і заможнай, мялешкінцы пажадалі, каб яе ўзначаліў Сяргей Паляшчук. Доўга аднекваўся былы франтавік. Справу ж прапаноўвалі яму новую, адказную—ці атрымаецца, сумняваўся. Але сялянская разважлівасць і кемлівасць падказвалі яму, што ён справіцца, зможа кіраваць калгасам...

Пачыналі амаль з нуля. А цяпер? Дзесяткі калгаснікаў за працоўныя дасягненні адзначаны ўрадавымі ўзнагародамі, сам Сяргей Паляшчук удастоены ганаровага звання Героя Сацыялістычнай Працы. У калгасе ўжо стала нормай збіраць высокія ўраджаі збожжа, бульбы, кукурузы, прадаваць штогод дзяржаве сотні тон мяса і тысячы тон малака. Гаспадарка мае мільённыя грашовыя прыбыткі! І ўжо не з калгаса едуць у горад на заработкі, а з горада ў калгас. Нядаўна ў Мялешкі прыязджаў гараджанін, сустракаўся са старшынёй.

— Працаваць хачу ў вас.

— А ты, браток, добра падумаў перш чым прыняць такое рашэнне?—пацікавіўся Паляшчук.— Сельская гаспадарка патрабуе асаблівай загартоўкі...

Аб гэтым старшыня мог і не пытаць. Колькі б людзей ні прымалі яны ў сваю сям'ю, ніхто не пакідаў потым калгас. Добрыя заробкі, высокі ўзровень жыцця—адметная рыса сённяшніх Мялешак. І ў гэтым поспеху—своеасаблівы талент Сяргея Палешчука, сына простага селяніна, умелага кіраўніка і арганізатара калгаснага сялянства.

Рыгор ПАСТРОН.

УДЗЯЧНАСЦЬ...

Лёс Андрэя Чыжыкава падобны на лёс тысяч іншых людзей. У гады Вялікай Айчыннай вайны быў снайперам. Вызваляў Беларусь. Пасля ранення пад Беластокам зноў вярнуўся ў строй. І зноў баі...

Тысячы кіламетраў франтавых дарог засталіся за плячыма. І сёння нанесеныя вайной раны ныюць, не даюць спакою, нагадваюць аб тых незабыўных днях і начах... Зрэшты, у чалавечай памяці хаваецца шмат розных падзей. Не забыць Андрэю Чыжыкаву і часы разрухі, аднаўлення разбуранай вайной народнай гаспадаркі... Усё гэта так помніцца. Помняцца і пражытыя гады ў Казахстане. Цаліна. Духмяны казахстанскі хлеб...

І вось які ўжо год сям'я Чыжыкавых жыве ў Беларусі. Па прыездзе ў Слонім Андрэй Сямёнавіч адразу ўладкаваўся на работу. Стаў працаваць слесарам у аўтакалоне. І сёння ён лічыцца ў калектыве вопытным і спрактыкаваным работнікам. Ёсць такое ганаровае званне — настаўнік моладзі. Гэта калі чалавек бескарысліва дзеліцца з маладымі рабочымі сваім багатым працоўным вопытам, вучыць моладзь не толькі ўменню ўвіхацца ля слясарнага верстака, але і выхоўвае пачуццё таварыскасці, адказнасці за даручаную справу. Дык у Андрэя Чыжыкава ёсць чаму павучыцца, што пераняць. Учарашнія яго вучні Уладзімір Баброў, Аляксей Трафімчык, Ігар Капылоў сёння сталі кваліфікаванымі спецыялістамі. І, як прызнаецца Андрэй Сямёнавіч, яму вельмі прыемна, што ў яго ёсць паслядоўнікі. А яшчэ жартуе:

— Не, не перавядуцца ў нашай аўтакалоне добрыя слесары...

Новы, 1982 год сям'я Чыжыкавых сустрэла ў новай двухпакаёвай кватэры ў цэнтры Слоніма.

А. ЖУКОЎСКІ.

ЧАЛАВЕК, ЯКІ СПЫНЯЕ ІМГНЕННЕ

У кожнага з нас свой погляд на ўсё, што адбываецца навокал. Але мастак адрозніваецца ад іншых, напэўна, адным — умее свой погляд выказаць у вобразе. І тады мы ловім сябе на думцы: «Дзесьці здаралася такое бачыць, адчуваць...» Так, сапраўды, даводзілася — у жыцці. Мастак спыніў імгненне і ўвасобіў яго ў карціне, скульптуры, музыцы...

Мабыць таму Зінаіда Ляўчэня на пытанне, адкуль бяруцца яе героі і вобразы, адказала: «З жыцця...»

Зінаіда Сяргееўна працуе на Магілёўскай фабрыцы мастацкіх вырабаў, і пад яе кіраўніцтвам шмат маладых майстрых вырабляюць разнастайныя сувеніры з ільну і саломкі. Сама яна лічыцца майстрам вырабаў з ільну, але працуе і з саломкай. А сімпатыю да паўночнага шоўку тлумачыць сваім дзявочым прозвішчам — Кудзелька...

Жыццё... Лёгка адчуць у абліччы гэтай жанчыны яго лепшыя фарбы. Сонечны колер валасоў, нібы тая саломка, высвечвае бадзёры настрой душы, а ўсмешка падкрэслівае гарэзлівую дзявочасць. Яе вучаніцы зазначаюць: «Зайздросцім мы Зінаідзе Сяргееўне. І ўдзячны ёй. Яна нас навучыла не толькі бачыць прыгожае ў звычайнай кудзелі ці саломе, але і ў жыцці адкрывае сваім прыкладам прыемныя таямніцы».

У цэху — жаночы калектыў і большасць работніц — зусім маладыя дзяўчаты. Таму і паўстаюць пытанні: якая сукенка будзе да твару, як пакроіць, пашыць (кроюць і шыюць часта ў доме Зінаіды Сяргееўны), як правесці вольны час, сустрэць свята, нават ці ісці на спатканне. На ўсе самыя нечаканыя пытанні яна, вераць дзяўчаты, дасць адказ, параду.

У чым сакрэт такой прыцягальнасці? Людзей прыцягваюць дабрата, душэўная шчодрасць, чалавечы і мастацкі талент. Побач з ёю нельга не заразіцца аптымізмам.

— ...Ведаеце, мне вельмі цяжка жыць,— уздыхае і заканчвае з усмешкай:— ад наплыву ўражанняў. На кожную рэч, з'яву глядзіш і прыкідваеш: што з гэтага можна зрабіць альбо як перадаць тую ці іншую сітуацыю. Хоць ты не выходзь з дому! Там я хоць на кухні «адпачываю»... На вуліцы, сярод людзей — немагчыма... Можа таму, што з палешукоў я. Яны надта дасціпныя.

Так, у Любанскім краі, а дакладней — у пасёлку Сосны, з'явілася на свет Зіна. Няўрымслівая, гарэзлівая дзяўчынка не ведала спакою і не давала яго малодшым і старэйшым братам і сёстрам. Сямёра іх у сям'і. Як памятае сябе, яна не разлучалася з іголкаю і кавалачкам тканіны, алоўкам, фарбамі, якія ў тыя пасляваенныя часы былі вялікай раскошай. Прайшлі гады, і насычанае справамі жыццё выхавала ў Зінаіды адметную рысу — працавітасць. І на рабоце, і дома ні хвіліны яна не патраціць дарэмна: то шые, то з сынам — пяцікласнікам Сярожам малююць акварэллю (любімая справа маці і сына), то чытаюць кніжкі. Усё гэта ў «вольны» ад хатніх спраў час. Таму гэтую жанчыну адзначаюць як добрую працаўніцу і адмысловую гаспадыню.

І ўсё ж Зінаіда Сяргееўна незадаволена сабой.

— Я вельмі цяжкі чалавек. Так часта спрачаюся з людзьмі, што, здаецца, акрамя непрыемнасцей для іх, больш нічога зрабіць не магу. І, ведаеце, адно суцяшае: нават пасля спрэчак яны па-ранейшаму ставяцца да мяне, прыходзяць раіцца па зусім далікатных пытаннях.

Я пачынала на Маладзечанскай фабрыцы мастацкіх вырабаў у 1968 годзе. Да гэтага кім толькі ні працавала, а захапленне пакідала, як кажуць, для душы. І вось дзесяць гадоў адпрацавала на фабрыцы і ўсё спрачалася.... Асабліва з дырэктарам Кларай Філіпавай. Мае поспехі і прызнанне прыйшлі там. Выстаўкі ў рэспубліцы, краіне, за мяжой. І абавязана я ўсім гэтым менавіта дырэктару. Нездарма кажуць, што ў спрэчках нараджаецца ісціна. Між іншым сябравалі і сустракаемся з гэтай жанчынай, як сёстры. Дзіўна!..

А мне падумалася, што супярэчлівы характар жанчыны ад прагі пошуку. Так, мастак павінен мець апанентаў, нават праціўнікаў, каб рухацца наперад. Дарэчы, рух — галоўны памочнік у творчасці Ляўчэні. Напярэдадні Алімпіяды ў Маскве ёй было даручана распрацаваць некалькі відаў сувеніраў. Зінаіда Сяргееўна зрабіла ўзоры, але мастацкі савет іх не зацвердзіў. Расчараванне? Было і такое. Тады майстар збіраецца і едзе на выхадныя да маці. Вяртаецца з дзесяткам эскізаў. І ўсе былі прыняты, а многія з іх адзначаны дыпломамі Аргкамітэта Алімпіяды.

— Як прыходзіць той ці іншы вобраз?— спытаў я.

— Бывае, зусім нечакана. Вось іду аднойчы з работы, сустракаю маленькага хлопчыка. Ён падаўся мне такім задзірыстым: шапка-вушанка на ім — адно вуха тарчыць уверх, другое ўбок, нібы толькі з бойкі выйшаў. Я не магла адарваць вачэй ад яго! Вось і з'явіўся сувенір «Заяц», а поза і характар у яго, як у таго гарэзлівага хлапчука...

Нельга не здзівіцца энергіі і рознабаковасці схільнасцей гэтай надзіва маладой і абліччам, і духам жанчыны. А між іншым, Зінаіда Сяргееўна можа стаць бабуляй: старэйшы сын Міша нядаўна ажаніўся. І ўсё ж на святах яна часта выступае ў ролі вядучай, бо валодае мастацкім словам, удзельнічае ў самадзейнасці, спявае.

Зазначу ад сябе: Зінаіда Сяргееўна—адмысловы субяседнік, пячэ смачныя дранікі, рыхтуе выдатныя рэзнікі і ўвогуле чалавек, як кажуць, на ўсе рукі майстар.

— Часам гавораць, навошта рабіць ёлачныя цацкі, калі іх у магазіне колькі хочаш. І не такія, як зробіш сам, а бліскучыя, прыгожыя,— заўважае Зінаіда Сяргееўна.— Не разумеюць, што створанае сваімі рукамі мае асаблівую прыгажосць...

Нельга не пагадзіцца з чалавекам, які ведае цану таму, што створана фантазіяй, натхненнем і працай. Наша сустрэча адбылася якраз пасля вяртання Зінаіды Ляўчэні з Францыі. Больш месяца яна паказвала сваё майстэрства ў многіх гарадах гэтай краіны. Яна была членам дэлегацыі Беларусі ў час Дзён СССР у Францыі. Калі ад'язджала, Сярожа даў маці тоўсты сшытак і сказаў: «Мама, ўсё, што ўбачыш, запісвай». Зінаіда Сяргееўна выконвала просьбу сына з вялікай стараннасцю — мы доўга чыталі гэты дзённік. У ім многа цікавых запісаў, але ўражвае іх інтанацыя — чым даўжэй знаходжанне ў краіне, тым часцей успамінаецца дом. І заканчваецца дзённік фразай: «Вось і ўсё, хутчэй дадому!»

Я запытаў Зінаіду Сяргееўну аб мары, якую яна хацела б здзейсніць пасля таго, як 300 яе герояў разышліся па свеце.

— Мара ёсць. Хоць я яшчэ не сустракалася асабіста з Вігнерэ Паўлс — сястрой вядомага латышскага кампазітара, але яна вельмі прыцягвае мяне сваім майстэрствам па вырабу габеленаў. Я таксама мару заняцца гэтай справай у будучым.

Георгій ПАВУЛЯ.

НА ЗДЫМКУ: Зінаіда ЛЯЎЧЭНЯ са сваімі вырабамі.

СЛОВЫ АД ШЧЫРАГА СЭРЦА

З Новым годам, дарагія сябры!

Прыміце нашу шчырую ўдзячнасць за вашу працу, якая дастаўляе нам радасць спаткання з далёкай любімай Радзімай.

Жадаем вам добрага здароўя, далейшых поспехаў у працы, міру на зямлі.

Іван ГІЛЕЎСКІ.

ЗША.

Паважаныя супрацоўнікі рэдакцыі газеты «Голас Радзімы» і беларускага таварыства «Радзіма».

Віншуем вас з Новым годам!

Жадаем вам усяго найлепшага ў жыцці, а галоўнае, здароўя і міру!

Марыя і Уладзімір ХІЛЬЧУКІ.

Канада.

Сардэчна віншуем з Новым годам!

Шчыра жадаем вялікаму савецкаму народу поспехаў у жыцці і працы.

Няхай мацнее дружба паміж народамі!

Няхай пашыраецца барацьба за мір на зямлі!

Ганна і Стэфан КАБАНЯЧЫЯ.

Францыя.

Ад усяго сэрца віншуем вас з Новым, 1982 годам!

Жадаем здароўя, шчасця і поспехаў у вашай высакароднай працы па ўмацаванню дружбы і міру на зямлі.

З цеплынёй успамінаем ваш горад-прыгажун Мінск і спадзяёмся на новую сустрэчу!

Стэла і Уладзімір ДУБІНЫ.

ЗША.

Усёй сям'ёй віншуем Беларускае таварыства «Радзіма» і рэдакцыю газеты «Голас Радзімы» з Новым, 1982 годам!

Нядаўна ў Ліёне нам пашчаслівілася бачыць і апладзіраваць групе беларускіх мадэльераў, якія карысталіся вялікім поспехам у гледачоў. І ў нас стала радасна на душы, калі ўбачылі беларускіх прыгажунь у касцюмах, пашытых у народных традыцыях. А яшчэ больш узрадавала нас выступленне ансамбля народных танцаў. Якое мастацтва! Які поспех! Перадайце артыстам ансамбля наша вялікае дзякуй.

Жадаем новых поспехаў ва ўсіх вашых слаўных справах.

Марыя ТАМАЙО.

Францыя.

Дарагія супрацоўнікі рэдакцыі «Голасу Радзімы».

Вялікае-вялікае дзякуй за вашу ўвагу да нас і дружбу. Вашу газету атрымліваем рэгулярна, даём чытаць і сваім сябрам. Захоўваю ў памяці сваю паездку ў Крыжоўку, як светлую радасць і шчасце. Ніколі не забуду ваш сардэчны прыём. Уся наша сям'я шле вам самыя найлепшыя пажаданні ў новым годзе!

Клара БЕРНАР.

Францыя.

Паважаныя сябры!

Сардэчна віншую вас і ўвесь народ Беларусі з Новым, 1982 годам!

Ад душы жадаю ўсім вам моцнага здароўя, вялікага шчасця і ўсяго самага радаснага ў жыцці.

Ігар АСТАПОВІЧ.

Аўстрыя.



У гэтым кафэ дзяцей чакае прыемная сустрэча з персанажамі добра вядомай у краіне казкі С. Аксакава «Пунсовая кветачка». Хаця, чаму толькі дзяцей! Новае кафэ, якое адкрылася нядаўна на праспекце Пушкіна ў Мінску, сардэчна запрашае татаў і мам, бабуль і дзядуль, але абавязкова з дочкамі, сынамі, унукамі і ўнучкамі.

Ветлівыя гаспадыні — тры казачныя сястры Насценька, Гардзея і Красава, афіцыянткі ў прыгожых касцюмах, прапануюць вам напіткі «Волат» і «Цудадзейны», жэле «Заморскае» і «Цуд-востраў», пірожнае «Чароўнае колца», малочныя кактэйлі, пячэнне, чай, каву, какаву.

Арыгінальна афармлены інтэр'ер гэтага новага будынка. На сценах вісяць малюнкі і маскі, якія адлюстроўваюць сцэнкі з казак. У зале гучыць музыка з мультфільмаў, што так любяць нашы дзеці.

Кожны дзень кафэ «Пунсовая кветачка» наведваюць больш як дзвесце дзяцей.

НА ЗДЫМКАХ: «Частуйцеся на здароўе!»— прапаноўвае афіцыянтка Т. ГЛАДКІХ; падабаецца бываць у «Пунсовай кветачцы» Ірыны ФІШ; буфетчыца З. НЯРОДА.

Фота А. ТАЛОЧКІ.



В НАШЕЙ СТРАНЕ НЕТ УСЛОВИЙ, ПОРОЖДАЮЩИХ ЭЛИТУ ОБЩЕСТВА

СУЩЕСТВУЕТ ЛИ В СССР «НОВЫЙ КЛАСС»?

Некоторые западные социологи, рассматривая социально-классовую структуру социализма, применяют «мерки» капитализма. По их мнению, такой универсальный подход позволяет раскрыть социальную природу любого «индустриального общества» — и капиталистического, и социалистического. Так, например, английский социолог Д. Лейн утверждает, что «социальное неравенство— универсальное социальное явление». Это «неравенство», как он считает, распространяется, следовательно, и на социально-классовую структуру советского общества.

Вероятно, по той же простой причине в западной литературе встречаются и рассуждения о появлении в социалистическом обществе «нового класса» («правящей элиты»). Сюда западные социологи относят советскую интеллигенцию, и в особенности людей, находящихся на руководящих постах в государственных органах, в партии, а также директоров предприятий и тех представителей советской интеллигенции, которые занимают руководящие посты в промышленности. «Начиная с 30-х годов,— пишет американский социолог П. Холландер,— в Советском Союзе в результате обдуманной политики и «инстинкта» сохранения режима возникли новые элиты..».

Западные социологи делят общество на классы по многим признакам. Среди них статус и престиж, образование, размер дохода, жизненные стандарты, тип жилища и т. п. Часть из них действительно связана с положением человека в обществе. Но, скажем, высшее образование в СССР не является чьей-либо привилегией: получить его имеет возможность любой гражданин (как рабочий, так и директор). Размеры дохода квалифицированного рабочего и начальника цеха нередко одинаковы. К тому же и тот и другой живут в государственных домах одного и того же типа. Таким образом, подобные признаки классов не являются научными, т. е. не отражают сущности этого социального понятия.

Согласно марксистской точке зрения, главным, определяющим признаком класса является отношение людей к средствам производства (земле, заводам, фабрикам, шахтам, транспорту и т. д.).

Так, класс капиталистов образуют люди, владеющие средствами производства и применяющие наемную рабочую силу в целях получения прибыли. Наемные рабочие лишены средств производства и добывают средства к существованию продажей своей рабочей силы. Таким образом, владение средствами производства обеспечивает привилегированное, элитное положение в обществе.

В СССР все средства производства находятся в общественной собственности, и, согласно Советской Конституции, никто не вправе использовать ее в целях личной наживы и в других корыстных целях. В Советском Союзе нет и не может быть капиталистов, равно как нет и не может быть классов, лишенных средств производства. Поэтому в условиях социализма рабочие не продают свою рабочую силу, не подвергаются эксплуатации, трудятся на общенародных предприятиях во имя постоянного роста материального и культурного уровня всех и каждого члена общества.

Крестьянство в СССР добровольно объединилось в производственные сельскохозяйственные кооперативы, коллективные хозяйства (колхозы). Интеллигенция имеет те же коренные цели, что и рабочие и колхозники, а потому не противостоит им в качестве касты, монополизировавшей завоевания культуры и находящейся на службе у «сильных мира сего».

Следовательно, благодаря перестройке общества на принципах социализма в Советском Союзе возникла социально-классовая структура, в корне отличающаяся от капиталистической. В СССР отсутствуют условия, порождающие элиту общества. Ведь само понятие «правящая элита» подразумевает определенную более или менее устойчивую группу людей, занимающую господствующее, привилегированное положение в обществе и преследующую узкоэгоистические интересы. Иначе говоря, элита — это избранные, живущие за счет эксплуатации остальных классов и социальных групп. В советском обществе эксплуатация человека человеком невозможна ни экономически, ни юридически. Каждый трудящийся в стране получает от общества в соответствии с количеством и качеством своего труда. Здесь господствует принцип «От каждого — по способностям, каждому — по труду». И ни один класс или социальная группа не имеют никаких привилегий по отношению к другим классам и группам.

К руководству социалистическим обществом демократическим путем привлекаются люди из всех слоев населения. Об этом свидетельствует социальный и профессиональный состав партийных и государственных учреждений всех степеней. В них широко представлены рабочий класс, колхозники, руководители предприятий и ученые, работники молодежных, партийных, профсоюзных организаций. А выборность и обязательная периодическая сменяемость значительной части избираемых в советские и партийные органы обеспечивают постоянный приток свежих сил, привлечение к руководству широчайших масс трудящихся.

Заработная плата работников управленческого аппарата примерно такая же, как и у рабочих. Так, в 1980 году среднемесячная зарплата работников аппарата органов государственного и хозяйственного управления, органов управления кооперативных и общественных организаций составляла 156 рублей. Среднемесячная же зарплата рабочих промышленности — 185,5 рубля, а рабочих в строительстве — 207,9 рубля, т. е. работники аппарата получают вознаграждение по количеству и качеству своего труда. Их благосостояние, как, впрочем, и остальных категорий трудящихся, целиком зависит от эффективности работы всего народного хозяйства. Таким образом, у работников аппарата общие интересы с рабочими, колхозниками, со всеми трудящимися.

Не обладают привилегиями и советские законодатели — депутаты органов власти. Их социальный портрет характеризуют следующие данные. Из 1 500 депутатов Верховного Совета СССР последнего, десятого созыва рабочих — 522, или 34,8 процента; колхозников — 244, или 16,3 процента; работников государственных, советских органов — 209 (13,9 процента); руководителей предприятий и специалистов народного хозяйства — 66 (4,4 процента) и т. д. В Советском Союзе нет депутатов-профессионалов. В соответствии с законом депутат осуществляет свои полномочия, не порывая с производственной или служебной деятельностью. Депутатские полномочия осуществляются безвозмездно. Депутат освобождается от своих производственных или служебных обязанностей на время сессий Совета, а также для осуществления депутатских полномочий в других случаях. При этом ему сохраняется средний заработок по месту постоянной работы. Не порывая с производством, депутат находится всегда в гуще масс, хорошо знает желания и нужды своих избирателей, регулярно встречается с ними. Это позволяет ему принимать такие законы, которые отвечают их интересам.

Включая в «новый класс» директоров предприятий, руководителей промышленности, западные социологи считают, что они, осуществляя контроль над средствами производства, обладают правом распоряжаться ими, получают экономические и финансовые привилегии.

Но даже в условиях капитализма неограниченным правом распоряжаться средствами производства обладают лишь реальные владельцы собственности. Любой предприниматель контролирует деятельность менеджера, может его уволить или принять на работу.

Советский директор предприятия — прежде всего представитель государства. Он выполняет волю народа. Как руководитель, он обеспечивает выполнение государственных планов производства и поставки продукции в установленной номенклатуре, ассортименте и надлежащего качества, планов капитального строительства, улучшения культурно-бытовых условий и условий труда рабочих и служащих. Следовательно, будучи руководителем предприятия, директор вместе с тем является и исполнителем научно разработанных и обоснованных государственных планов. Ему даны широкие права. Но он не является хозяином предприятия, не может продать его, передать по наследству, перевести часть капиталов в другие отрасли промышленности, сократить производство и т. д. В своей административной деятельности директор отвествен и перед государством, и перед коллективом самого предприятия. Например, только в 1979 году за недостатки и упущения в работе по требованию профсоюзных и других общественных организаций 146 хозяйственных руководителей были освобождены от занимаемых постов. Другими словами, советский директор не может воспользоваться капиталовложениями в своих личных целях. Он получает за свой труд вознаграждение на основании принципа социалистического распределения. Так, в 70-х годах зарплата руководителей Московского автомобильного завода имени Лихачева была в два-три раза больше, чем у квалифицированных рабочих. А на предприятиях «Фиат» оклад технического руководителя в десять раз превышает заработок квалифицированного рабочего.

Кстати, объективности ради можно заметить, что далеко не все западные социологи разделяют точку зрения представителей теории «нового класса». В частности, австралийский историк Л. Черчуорд приходит к следующему выводу: «Главная особенность советской интеллигенции состоит в том, что она не представляет собой «правящего класса» или «класса менеджеров» и что она не владеет частной собственностью».

Виктор САПРЫКОВ.
(АПН).

Камуніст з 1912 года Аляксандр Касценка — паважаны ў Рэчыцы чалавек. У ліпені 1917-га ён узначаліў павятовы камітэт РСДРП, прымаў удзел у грамадзянскай вайне, у будаўніцтве новага жыцця на Палессі, адстойваў гонар і незалежнасць Радзімы ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Заслугі Аляксандра Сцяпанавіча адзначаны ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, многімі медалямі ратнай і працоўнай доблесці. Першаму ў нашай рэспубліцы Аляксандру Касценка ўручаны нагрудны знак «50 год знаходжання ў КПСС».
НА ЗДЫМКУ: маладыя камуністы віншуюць ветэрана партыі А. КАСЦЕНКУ з уручэннем яму нагруднага знака «50 год знаходжання ў КПСС».
Фота І. ЮДАША.

На просторах Родины

ЩЕДРОЕ МОРЕ

Берега нашей страны омывают двенадцать морей. И каждое по-своему знаменито и славно. Охотское — самое щедрое, самое богатое рыбой.

Сегодня известно: Мировой океан отнюдь не бездонная бочка, набитая доверху рыбой и прочей живностью. С 1960 по 1970 год общий вылов регулярно увеличивался каждый год почти на шесть процентов. Думали, что так будет продолжаться бесконечно. Но ошиблись. И в позапрошлом году вместо предполагавшихся ста миллионов тонн человечество добыло только 73 миллиона тонн всех видов морских продуктов.

— Мы вовремя прекратили работать вслепую, не думая о завтрашнем дне, поклоняясь единственному принципу: брать, брать и брать, — сказал мне Геннадий Михайлов, заместитель начальника Магаданского объединения, которое ведет лов на огромных просторах Тихого океана от Берингова пролива до юга Камчатки. — Особенно осторожными надо быть здесь, на Дальнем Востоке, где море так богато. Любой свой шаг мы предварительно обсуждаем с местными научными институтами, пользуемся их рекомендациями. И вы знаете, результаты прекрасные. Этим летом наши реки, как и прежде, в период нереста бурлили от тысяч и тысяч огромных красивых лососей.

Конечно, не последнюю роль сыграло и неукоснительное соблюдение всех международных конвенций по рыболовству. У нас теперь нет претензий к соседям по Тихому океану. А раньше даже смотреть было жалко, когда в дальневосточные реки лососи приходили с ободранными боками. Это те, что прорвались через километры жестких сетей, выставленных в открытом море. А сколько их погибало, так и не добравшись к традиционным местам нереста. Сейчас такого уже нет. Это, разумеется, радует. Ежегодные заседания советско-японской комиссии проходят бурно, но плодотворно, по-деловому. Все больше и больше людей понимают, что мы живем на одной планете, что дома наши рядом и кормит нас один и тот же океан.

К великому удовольствию всех рыбаков, истекает срок запрета промысла, и мы вновь начинаем промышленный лов знаменитой охотской сельди, традиционной для русского стола. Лов будет регламентирован объемами и условиями с расчетом, чтобы и завтра рыба не кончилась, не исчезла.

Рыбаки наши, образно говоря, теперь не только жнут, но и сеют.

У Охотского моря есть, к сожалению, один недостаток: жестокие шторма выбрасывают на берег водоросли, в которых сельдь мечет икру. Но еще старики приметили, что икра попадает и на сети. Вот этим мы и воспользовались. Сейчас в удобных бухтах, но подальше от берега, в чистой воде ставим тысячи неводов. За нерест они покрываются слоем икры толщиной до десяти сантиметров. Чтобы сети не утонули, даже поддерживаем их поплавками. Так мы спасаем миллиарды икринок.

Поможешь природе — значит, будешь с рыбой. Это мы проверили. Море, как и хлебное поле, всегда благодарно.

...Мы шли на катере «Хрусталь» из порта Магадана в открытое море. От воды веяло холодом. Это чувствуешь, даже стоя на палубе. Но вдруг теплый ветер гладит щеки. Значит, где-то рядом остров. Где-то вблизи согретые солнцем его скалы. А значит, где-то недалеко и сейнер «Гранит». Об этом нам недавно сообщили по радио.

Подходим к «Граниту», когда рыбаки уже начали выбирать трал. Режет волну, скрипит в блоках стальной трос. Даже издали чувствуешь: груз вытягивает солидный. Забеспокоились чайки. Вот вынырнули яркие поплавки, будто на темную воду кто-то высыпал гигантские оранжевые бусы. Наконец выплывает и трал.

Раздутый кошелек уже над палубой. Чайки ошалело носятся рядом. Еще минута — и радужный ливень рыбы хлынул в трюм.

— Тонн тридцать будет! — кричит нам через борт довольный тралмастер Василий Гордеев.

— Не тяжело?

— Чем больше, тем легче, — смеется он. — Это отдыхать на Охотском море прохладно. А работать — горячо. Уж очень хорошая рыба.

И снова трал ушел на глубину, и снова вернулся полный. И снова в трюм хлестал живой ливень.

А вокруг было полное солнца и рыбы Охотское море. Крупные волны, среди которых зимой и летом качаются рыбацкие суда. Круглый год работают люди.

Юрий ТЕПЛЯКОВ.

ЛЮБЛЮ НАШ КРАЙ...

Выйшла ў свет новае двухтомнае выданне твораў старэйшай беларускай паэтэсы Канстанцыі Буйло. Па шчасліваму збегу абставін адбылося гэта напярэдадні Новага года і дня нараджэння Канстанцыі Антонаўны [яна нарадзілася па н. ст. 11 студзеня 1899 года ў Вільні]. Яе першы зборнік «Курганная кветка», як вядома, з'явіўся ў 1914 годзе. З таго часу на працягу амаль 70 гадоў вершы К. Буйло выдаваліся асобнымі кніжкамі, змяшчаліся ў перыядычным друку на рускай і беларускай мовах.

Апошні двухтомнік — найбольш поўны збор твораў паэтэсы. У ім сабрана лепшае з напісанага за доўгае плённае жыццё. Упершыню, бадай, поўнасцю перадрукавана «Курганная кветка». Рэдактарскія праўкі пры перадруку не рабіліся, і мы чытаем творы такімі, якімі бачыў іх рэдактар зборніка — Янка Купала.

Першы том ахоплівае перыяд з 1913 па 1951 год. Мала пісала паэтэса ў 30-я гады, і таму вершаў гэтага перыяду нямнога ў выданні. Пачынаючы з 1941 года, паэтычны голас Канстанцыі Буйло зноў гучыць у поўную сілу. І ўсё лепшае, што было напісана ў Вялікую Айчынную вайну, змешчана ў гэтай кніжцы. У кожным вершы трывога грамадзяніна за свой край, на які напалі чужынцы і топчуць яго, пякучы боль страт, якія немінуча нясе вайна, нязломная вера ў нашу перамогу.

Заканчваецца том аўтабіяграфічнай паэмай «Па траскіх гацях», яна пакарае непасрэднасцю і паэтычнасцю расказа аб дзіцячых і юначых гадах пісьменніцы.

Другі том адкрываецца вершам, прысвечаным Янку Купалу. Свайму настаўніку і сябру Канстанцыя Буйло прысвяціла нямала вершаў, сказала шчырых слоў удзячнасці, перадала сваё захапленне ім як паэтам і чалавекам.

Пасляваенны час і аж да 1975 года быў найбольш плённы, найбольш цікавы ў творчасці паэтэсы: яна набыла багаты жыццёвы вопыт і думкамі, духоўнымі набыткамі магла падзяліцца з чытачамі. Найлепшае з лірыкі К. Буйло прысвечана Беларусі, якую яна любіць так пяшчотна і аддана.

Паэтэса за сваё доўгае жыццё мела шчасце сустракацца з мноствам выдатных людзей. Яны пайшлі ад нас, але іх асоба, справы, творчасць хвалююць і цікавяць нашчадкаў. У часопісах, на старонках рэспубліканскіх газет неаднойчы з'яўляліся артыкулы Канстанцыі Буйло, у якіх яна расказвала пра Янку Купалу, яго жонку Уладзіславу Францаўну, Зм. Бядулю, М. Лынькова, П. Глебку і іншых. Успаміны друкуюцца ў другім томе выдання.

Гэтая старонка «Голасу Радзімы» прысвечана выхаду ў свет двухтомніка нашай любімай паэтэсы. Аб яе творчасці расказвае рэдактар выдання пісьменнік Хведар Жычка.

БЛАСЛАВЁНАЯ КУПАЛАМ

Ёй пашчасціла на самым пачатку творчай дарогі. Першым чытачом, дарадчыкам, кансультантам яе вершаў, першым яе літаратурным настаўнікам, рэдактарам першай яе кнігі быў вялікі Купала. Апека гэтая не была выпадковасцю, як некаму сёння можа здавацца. У рэдакцыю «Нашай нівы» трапілі не проста вершы здольнай маладой паэтэсы, дзе былі ўдалыя радкі, свежыя вобразы, якія спадабаліся Янку Купалу. Не, да Купалы даляцеў голас, якога ён чакаў, каб пацвердзіць правату сваіх поглядаў, нібы вярнулася рэха ягоных песень. Маладую паэтэсу трывожылі думкі і пачуцці, якія не давалі спакою і яму, Купалу. Канстанцыя Буйло адразу стала ў строй барацьбітоў за новую беларускую літаратуру. Сама яна, праўда, яшчэ была вельмі далёка ад літаратурных дыскусій, але яе шчырыя вершы дапамагалі нашаніўцам змагацца з ліберальна-буржуазнымі эстэтамі, якія выступалі супраць цеснай сувязі паэзіі з жыццём народа, заклікалі «аплачваць доўг» услаўленнем гоману бору, пляску вады, задумення змроку і ясноты ўсходу... У артыкуле «Чаму плача песня наша?» Янка Купала даў водпаведзь гэтым эстэтам. Паэт пісаў:

«Калі ў памятны 1905 г. зрабілася завіруха, калі ў Расіі ў кожнага чалавека стала будзіцца душа да новага жыцця, да новага шчасця, то і ў беларуса будзіцца стала пачуццё свайго «я», стала лунаць доўга дрэмлючая думка, што і мы людзі. Паявіліся паэты, песняры свайго, забытага богам і людзьмі, краю і долі народнай... ...Гэтыя паэты, усасаўшы з малаком абнядоленых і абняволеных матак усё гора жыцця Беларусі дэмакратычнай, — ці ж маглі ў першых сваіх словах апяваць толькі хараство сваёй Бацькаўшчыны, не заглянуўшы спачатку на рэальны быт яе сыноў?! Канешне, душа паэта перш-наперш запяяла тое, што ў ёй накіпела праз доўгія гады цярпення і акружаючай беспрасветнай нядолі».

У яшчэ тады не так і шматлікі хор песняроў мужыцкай нядолі ўліўся і голас Канстанцыі Буйло, якая ўслед за Купалам і Коласам заклікала:

Да працы, да светлай, вялікай работы,
З абломкаў, руінаў тварыць новы дом!

Канстанцыя Буйло нядоўга заседжвалася ў пачынаючых паэтах. Ды і наогул, ці была яна калі пачынаючай у сённяшнім разуменні гэтага слова? Адзін з першых яе вершаў «Люблю» стаў народнай песняй. Першы яе зборнік вершаў «Курганная кветка» стаў значнай падзеяй беларускай нацыянальнай культуры. «Талентнай паэткай» назваў яе Янка Купала ў 1913 годзе і шкадаваў, што ў сваю першую кнігу яна «не памясціла болей сваіх задушэўных песень».

Аб уплывах купалаўскай паэзіі на творчасць Канстанцыі Буйло пісалі многія даследчыкі. Была вучоба ў Купалы, былі перайманні, перапевы. Вось радкі з верша Канстанцыі Буйло 1914 года «Курган»:

Тут, бывала, штоноч цэлы двор у агнях;
Шмат паноў адусюль наязджае,
Цэлу ноч п'юць, пяюць і гуляюць яны,
Без устанку музыка іграе...

Адразу ўспамінаецца «Курган» Янкі Купалы, нават рытміка тая ж: «Паміж пустак, балот беларускай зямлі...» Сюжэт у Буйло іншы: панская дачка Галіна пакахала сялянскага хлопца Янука. Бацька аддае Галіну за багатага і нялюбага. На вяселлі маладая выйшла з застолля, уцякла да каханага, і яны абодва кінуліся ў рэчку, утапіліся... Тэма разняволення жанчыны, яе права на каханне пройдзе праз усю творчасць Канстанцыі Буйло. Пазней яна напіша многа цудоўных радкоў аб свяце кахання, аб вернасці, аб чыстаце чалавечых узаемаадносін у краіне, якая, як купальская кветка, расцвіла народным шчасцем.

Дружба з Янкам Купалам, творчая вучоба ў яго былі тым зарадам, які жывіў і па сёння жывіць творчасць Канстанцыі Буйло. У вершах, прысвечаных светлай памяці Купалы, паэтэса нібы дае творчую справаздачу свайму настаўніку. Вобраз Купалы зліваецца ў яе з вобразам Беларусі:

Наш край — і ты...
Скажу вось: Беларусь,
У гэтым слове мне гучыць: Купала.
Ды так гучыць, аж я сама здзіўлюсь,
Як быццам разам словы я сказала.

Прыціхлая была муза Канстанцыі Буйло ўстрапянулася, заіграла на сурмах трывогу, ва ўсе званы забіла, калі над нашым краем, над роднай старонкай, над хацінамі «ў зелені садоў», над залочанымі збожжам нівамі навіслі чорныя хмары вайны. Думкі пра зняволеную Беларусь, захапленне гераізмам савецкіх людзей, нянавісць да фашысцкіх захопнікаў абвастраюць патрыятычныя пачуцці, пераплаўляюць іх у паэзію высокага гарту. Канстанцыя Буйло добра ўсведамляе, што паэт і яго песня павінны быць у гэтыя суровыя дні на пярэднім краі.

Менавіта ў дні вайны бурна расце творчая актыўнасць паэтэсы, з-пад яе пяра нараджаюцца эмацыянальнай сілы творы.

Ажыўшае, загартаванае пад суровымі вятрамі дрэва паэзіі буйна расквітнела і налівалася пладамі пад мірным сонцам пасляваеннага часу. Адна за адной выходзяць кнігі: «Світанне», «Выбраныя творы», «На адноўленай зямлі», «Май», «Роднаму краю», «Юрачка», «У бляску зор». У іх паэтэса славіць сваю родную Беларусь, яе гераічны і працалюбівы народ, славіць мір, стваральную працу. Героямі яе твораў становяцца тыя, хто будуе новае жыццё — аратыя і шахцёры, механізатары і ткачыхі. Усё цікавіць Канстанцыю Буйло, усюды яна хоча пабыць, усё пабачыць на свае вочы. І вядома, ва ўсім знаходзіць паэзію. Сваё замілаванне, сваю любоў да жыцця яна імкнецца адразу ж перадаць чытачу, нібы запрашаючы: ну, парадуйся са мной разам, дарагі сябар. І вядзе яго ў поле, дзе «хвалюецца жытнёвы акіян», на бераг Нарачы, якая «гойдае на хвалях песню, як сястру сястра», у Мінск, дзе «новы мост пралёг над Свіслаччу», вядзе па дарогах і сцежках старонкі роднай — Беларусі.

Чаго няма ў вершах Канстанцыі Буйло, дык гэта — суму. Не любіць яго паэтэса. «Не давай разгону думкам сумным»,— раіць яна.

Як і на пачатку творчага шляху, Канстанцыю Буйло хвалюе пытанне аб месцы паэта ў жыцці. Верная купалаўскім традыцыям, цяпер, з вышыні гадоў і творчага вопыту, яна патрабуе ад паэтаў і ў першую чаргу ад самой сябе:

Дайце верш, каб узяў ён, як жэмчуг з дна мора,
Душ багацце людскіх, думак смелых прасторы.
Дайце верш, каб адбіўся ў ім воблік Радзімы,
Каб, як сонца, заззяла яна прад вачыма.

Многа такіх вершаў, якія «за сэрца кранаюць прачулым словам», стварыла Канстанцыя Буйло за свой сямідзесяцігадовы творчы век. Аб гэтым сведчыць выдадзены ў канцы мінулага года выдавецтвам «Мастацкая літаратура» двухтомнік яе выбраных твораў, у прадмове да якога народны паэт Беларусі Максім Танк піша:

«Ад самага пачатку, з таго далёкага дакастрычніцкага часу, калі ў нашай літаратуры так хораша ўзышла цудоўная «Курганная кветка», блаславёная самім Янкам Купалам, паэзія Канстанцыі Буйло была па-добраму простай, нягучнай і вельмі шчырай. Здавалася, зусім ціха прамаўляліся словы, але іх пачулі і палюбілі многія людзі. Палюбілі як ўсё роднае і спрадвеку блізкае, пра што адразу ж незабыўна сказала паэтэса, сказала задушэўна, прывабна і светла: «Люблю наш край — старонку гэту, дзе я радзілася, расла...»

І вось праз многія дзесяцігоддзі, што ўвабралі ў сябе столькі падзей і нечуваных пераўтварэнняў, мы чытаем сёння творы Канстанцыі Буйло, адрасаваныя «Вялікай Радзіме» (такую назву мае адзін з вершаў сямідзесятых гадоў). Чытаем з хваляваннем і радасцю, з адчуваннем, што слова паэтэсы застаецца ўсё такім жа задушэўным, ясным, свежым і выразным.

Такую высокую ацэнку сваёй творчасці Канстанцыя Буйло заслужыла шматгадовай карпатлівай і настойлівай працай на ўзаранай Купалам ніве, вернасцю рэвалюцыйным традыцыям нашай беларускай савецкай паэзіі.

Хведар ЖЫЧКА.

Канстанцыя БУЙЛО

АДНА

Адна, ізноў адна, як колас той у полі,
Не сцяты ў час жніва нагостраным сярпом,
Зламаны ветрамі гулячымі на волі
Між апусцелых ніў, спалосканых дажджом.

Адна, ізноў адна... Тужліва сэрца ныe.
Наўкола пуста, глуш. Ноч цёмная стаіць.
А за акном віхор так жаласліва выe,
Як бы сканаць не мог, не хочучы больш жыць.

І сумна, сумна мне. Дзе ж той, каго любіла!
Дзе ж тыя, што мяне любілі так даўней!!
Адны забыліся, другіх ўзяла магіла...
І жаль мне прошлых мар, шчаслівых шкода дней.

Адна, ізноў адна... А вецер думцы ўторыць,
І стогнамі мяне ўцяшае ён сваімі:
— Я брат табе, я друг, — мне, стогнучы, гаворыць,—
Адзін нас ломіць боль — дык плачмо ж разам мы!..

1914 г.

ЛІПЫ

Водар салодкі наўкола льюць ліпы,
Як матылькамі хтось дрэўцы абсыпаў...
Вецці — у кветках імкліва-крылатых,
Быццам бы ў ветразях туга напятых.
Так вось глядзіш, і праз хвілю здаецца,
З ножкі галінка ў палёт адарвецца
І панясецца з вятранаю хваляй,
Пахам мядовым напоўніўшы далі...

На Беларусі таксама ёсць ліпы,
Не матылькамі іх ліпень абсыпаў.
Вораг, на захад адходзячы міма,
Іх апавіў і пажарам і дымам.
Курчацца ў полымі свежыя вецці,
Зоры пажарам над імі там свецяць...
Нерасквітнеўшыя родныя ліпы
Попел ад спаленых вёсак абсыпаў.

1944 г.

* * *

Чайныя ружы ў мяне на стале
Свецяцца квола ў вячэрняй імгле,
Свецяцца бляскам сваім залацістым,
Дыхаюць водарам, тонкім і чыстым.

Зусім нечакана, быццам бы госць,
Смела ўваходзіць мая маладосць,
Сны мае будзіць, ўзнаўляе падзеі,
Думы і мары, жаданні, надзеі...

Бачу я тых, што навекі зляглі
Спаць беспрабудна ў халоднай зямлі.
Вось — мая Уладка! Мой родны Купала...
Радасць жывая ў вачах іх заззяла.

Горача іх я да сэрца тулю,
Іх я навекі ўсім сэрцам люблю!
Пах гэтых руж, як вясна, малады,
Сціпла закрэсліў старыя гады...

Бачу я блізкіх — цяжкае гора
З сэрца сплывае, як чорная змора...
Веру я ў шчасце... Бо — ў шэрай імгле —
Свецяцца ружы ў мяне на стале.

1964 г.

* * *

А старасці няма! Ты ёй не вер,
Калі ў грудзях жывое сэрца б'ецца,
Калі з грудзей свабодна песня льецца,
Сум мой знікае, як драпежны звер,
І неба, і блакіт вачэй смяецца,—
Ты старасці не вер!

Ты вер, ты вер, што старасці няма,
Здзірае восень ліст пажухлы з клёна,
Ля сонца сталі шэрых хмар заслоны,
Ідзе за імі лютая зіма
З бязмежнай даўжынёй начэй сцюдзёных...
А ты!.. Ты вер, што старасці няма...
А толькі знай: за той зімой імглістай
Зноў прыйдзе май у кропельках іскрыстых.
Аб ім ты думай! Ты яго чакай!
Зноў прыйдзе май!

1972 г.

РЭСПУБЛІКА — УДЗЕЛЬНІЦА ПРАЙШОЎШЫХ ДЗЁН СССР У ФРАНЦЫІ

«ЯК ГІМН СІНЯВОКАЙ КРАІНЕ»

Летась у багатай і разнастайнай праграме Дзён СССР у Францыі прыняла ўдзел наша рэспубліка. Жыхары Парыжа, Клермон-Ферана, Ліёна, іншых гарадоў краіны сустрэліся з дэпутатамі парламента Беларусі, вядомымі вучонымі, актывістамі таварыства «СССР — Франция», а таксама ўбачылі выступленні гімнастаў, Дзяржаўнага ансамбля танца БССР, паказ моды, выстаўку нацыянальнага касцюма, беларускай графікі і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Аб паездцы дзеляцца сваімі ўражаннямі дзеячы беларускай культуры.

Дырыжор аркестра Дзяржаўнага ансамбля танца БССР, кампазітар У. КАНДРУСЕВІЧ.

— Шчыра кажучы, усе мы вельмі хваляваліся. Да гэтай паездкі калектыў падрыхтаваў новую праграму з двух аддзяленняў. Першае — «Беларусь сінявокая» — складалася з нацыянальных танцаў рэспублікі, а ў другім было адлюстравана харэаграфічнае мастацтва народаў нашай многанацыянальнай Радзімы.

Ужо першы канцэрт выклікаў вялікую цікавасць французскіх гледачоў, аб чым сведчылі і водгукі ў прэсе. Так, газета «Мантань», якая выдаецца ў Клермон-Феране, пісала, што праграма, паказаная беларускімі артыстамі, стала гімнам прыгажосці і велічнасці сінявокай Беларусі. А калі мы выступілі ў парыжскай канцэртнай зале «Пліэль», сталічная газета «Матэн» параўнала праграму ансамбля з сапраўдным спектаклем, які раскрывае ўсё багацце фальклору народаў, з'яднаных у Савецкай дзяржаве.

У антрактах канцэртаў музыканты ансамбля звычайна выходзілі да публікі, гутарылі з людзьмі, адказвалі на іх пытанні, дарылі сувеніры. У мяне таксама адбылося нямала цікавых знаёмстваў. Неяк да мяне падышоў чалавек, які прадставіўся выкладчыкам калежа, і папрасіў дазволу паглядзець беларускую дудку, гучаннем якой ён быў зачараваны. Да таго ж, гэты чалавек, аказваецца, даўно збірае старажытныя народныя інструменты, мае вялікую іх калекцыю.

Французы — шчырыя і непасрэдныя людзі. Асабліва сардэчна і цёпла нас сустракалі ў прамысловых гарадах, дзе многа рабочых. У Ліёне, Марселі яны прыходзілі за кулісы, каб лепей разгледзець касцюмы артыстаў, узяць аўтограф, проста паціснуць руку. Гэта іншы раз кранала да слёз.

Ансамбль танца зрабіў сапраўдны «тур дэ Франс» — паездку па краіне, выступіў у 30 гарадах, даў 40 канцэртаў, якія прайшлі з аншлагам.

Адбыліся цікавыя сустрэчы ў харэаграфічнай школе ў Монтэ-Карла, дзе нас прымала вядомая ў мінулым балерына Марыка Безабразава, руская па паходжанню. У парыжскім цэнтры мастацтваў мы пазнаёміліся з вядомымі дзеячамі харэаграфічнага мастацтва Францыі, паэтамі, музыкантамі. Іх цікавіла ўсё: наша гісторыя, традыцыі, звычаі. Артысты ансамбля мовай танца пастараліся расказаць гледачам пра сваю радзіму — Беларусь.

Загадчык аддзела Міністэрства культуры БССР, мастак М. МІРОНАЎ.

— Традыцыйныя Дні Савецкага Саюза ўпершыню далі магчымасць французам пазнаёміцца з беларускай графікай. Выстаўка адкрылася ў горадзе Клермон-Феране, што знаходзіцца за 500 кіламетраў ад Парыжа. На яе адкрыцці ў Палацы кангрэсаў прысутнічалі генеральны сакратар таварыства «Францыя—СССР» Эр Руса, намеснік мэра Клермон-Ферана Мезанет, іншыя афіцыйныя асобы.

На выстаўку прыходзілі цэлымі сем'ямі, з малымі дзецьмі. Вельмі ўважліва вывучалі прадстаўленыя на ёй работы, часам звярталіся да мяне з пытаннямі. Убачыўшы ліст пад назвай «Бумеранг» з касмічнай серыі Г. Паплаўскага, дзе адлюстраваны фантастычны лятальны апарат, у мяне спыталі, ці не новая гэта савецкая зброя? Увачавідкі я пераканаўся ў тым, як моцна ўбіта ў галовы людзей ідэя аб «савецкай ваеннай пагрозе». І мне здаецца, што наша выстаўка ў нейкай меры садзейнічала таму, каб развеяць гэты міф, створаны буржуазнай прапагандай.

З 50 работ, прадстаўленых на выстаўцы, гледачамі былі асабліва адзначаны аркушы з серыі «Памяці вогненных вёсак» Васіля Шаранговіча аб вайне, «Ой, ляцелі гусі», «Бывайце здаровы!», «Антонаўскія яблыкі» Алесі Паслядовіч, пейзажы Уладзіміра Пашчасцева, літаграфіі Ільі Немагая па матывах рамана Васіля Быкава «Альпійская балада».

Тут мне давялося ўбачыць нашых суайчыннікаў. Памятаю, як пажылая жанчына плакала ля палескага пейзажа. На маё пытанне, што здарылася, яна нічога не магла адказаць, так была ўзрушана. Потым ужо я даведаўся, што яна родам з Гомельшчыны, дзе і цяпер жыве яе сваячка.

Дацэнт Беларускага Дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута, кандыдат мастацтвазнаўства М. РАМАНЮК.

— Усім вядома, што парыжан вельмі цяжка чым-небудзь здзівіць. Але выстаўка беларускага нацыянальнага касцюма, якая была арганізавана па ініцыятыве таварыства «Францыя—СССР» і дэманстравалася амаль месяц, яшчэ на нейкі час затрымаецца ў Францыі: Музей Чалавека ў Парыжы прапанаваў нам паўтарыць экспазіцыю.

На маю думку, поспех быў заканамерным. Таму што парыжане адкрылі для сябе зусім новую, цікавую старонку ў гісторыі традыцыйнага адзення. Даволі даўно, у 1925 годзе, калі маладая Савецкая рэспубліка ўпершыню прыняла ўдзел у Сусветнай выстаўцы ў Парыжы, на ёй быў прадстаўлены рускі народны касцюм. Здаецца, з таго часу падобных выставак не было. Наша складалася з святочных і абрадавых касцюмаў, якія адлюстроўвалі ўсе рэгіёны рэспублікі. Большасць адзення была сабрана за апошнія 5 гадоў. Акрамя гэтага, у зале, дзе дэманстраваліся беларускія касцюмы, мы змясцілі фотаздымкі, на якіх адлюстраваны людзі, апранутыя ў гэткае ж адзенне, у прывычным для сябе асяроддзі — на вяселлі, у хаце або ў полі. Усё гэта так уражвала наведвальнікаў, што яны часам імкнуліся памацаць рукамі экспанаты, каб упэўніцца ў іх натуральнасці.

Чарговы нумар часопіса «Францыя — СССР» чатыры старонкі прысвяціў беларускаму нацыянальнаму касцюму, змясціўшы побач са здымкамі праслаўленых БелАЗаў здымкі кабет у прыгожым адзенні... А на вокладцы надрукаваў партрэт жанчыны з Усходняга Палесся, апранутай у традыцыйны святочны касцюм, які, дарэчы, зроблены ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзя. З гэтага ж здымка была зроблена і вокладка для запрашальнага білета, для буклета.

Перад уваходам на выстаўку працавала слайдатэка, гучалі беларускія народныя мелодыі. Многіх зацікавіла адзенне, якое, аказваецца, цалкам выраблена ўручную. Потым давялося весці дыскусію з нейкім чалавекам з Англіі, які не пажадаў назваць сваё імя. Ён выказаў сумненне ў тым, што наша выстаўка адлюстроўвае сапраўдную народную эстэтыку, маўляў, тое, што дэманструецца—маглі насіць толькі багатыя людзі, а для астатніх—лапці ды шэрая спадніца. Я мусіў расказаць яму трохі пра Беларусь, пра шматлікія матэрыялы, сабраныя супрацоўнікамі Дзяржаўнага музея БССР, і пра тое, што на выстаўцы дэманструецца адзенне сярэдняга сялянства. Нарэшце майму апаненту давялося прызнаць, што ён увогуле мала ведаў пра Беларусь, а тое, што ведаў, было скажоным, недакладным. На развітанне ён пажадаў поспехаў нашаму народу ў стваральнай працы, сказаў, што мае намер прыехаць у Савецкі Саюз — краіну, якая вельмі зацікавіла яго.

Запісала Таццяна АНТОНАВА.

НА ЗДЫМКУ: на адкрыцці выстаўкі «Беларускі нацыянальны касцюм» у Парыжы.

ЯНА БЫЛА ЖОНКАЙ, СЯБРАМ, ДАРАДЧЫКАМ

РУПНАСЦЬ

ДА 90-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ УЛАДЗІСЛАВЫ ЛУЦЭВІЧ

Яе любілі і паважалі ўсе. І блізкія, і далёкія—і той, хто спазнаваў з ёю нягоды і радасці жыцця, знаходзячыся побач, і той, каго яна клапатліва выводзіла ў людзі, і той, хто сустракаўся часта, і той, хто бачыўся толькі мімаходзь.

Для ўсіх яна была абаяльнай і шчырай цёцяй Уладзяй. Простая і таварыская, Уладзіслава Францаўна ўмела гаварыць з кожным, разумець і цаніць людзей, была прыемнай субяседніцай. Яна валодала выдатнай якасцю—тонка разбіралася ў чалавечых душах. Гэтая рыса выпрацавалася, відаць, за час шматгадовай работы з дзетварой. Трыццаць чатыры гады штодзённых клопатаў і хваляванняў, радасцей і перамог многаму навучылі Уладзіславу Францаўну. Колькі розных, адметных характараў маленькіх грамадзян прайшло праз яе рукі! Многія з іх і сёння ўспамінаюць лагодным словам любімую выхавацельку. Успамінаюць яе ласку і цяпло, мацярынскую адданасць і пяшчоту. Многія, напэўна, памятаюць і бадзёрыя песенькі, вясёлыя вершыкі, прыпеўкі, дасціпныя жарты і загадкі, якія развучвала з імі ў дзіцячым садзе энтузіяст-педагог. Большасць гэтых твораў былі дбайна сабраны самой Уладзіславай Францаўнай і выдадзены асобнымі кніжкамі. Ёю апрацаваны і народныя казкі для дзяцей «Як пеўнік казу прагнаў» і «Пых».

Цёця Уладзя мела добрую памяць. Магла ўзнаўляць нават дробязныя дзеі даўно мінулых дзён. Часта яе ўспаміны проста ці ўскосна датычыліся Янкі Купалы. Пра яго заўсёды думала і дбала Уладзіслава Францаўна, ім, яго творчасцю больш за ўсё даражыла заўзятая прыхільніца роднага слова.

Будучы пры жыцці паэта яго найпершым крытыкам і дарадчыкам, Уладзіслава Францаўна пасля смерці Купалы стала найпершым папулярызатарам яго літаратурнай спадчыны.

«Памяць Янкі—гэта ўсё, што засталося мне ў жыцці»,—пісала яна знаёмым у 1943 годзе. Памяці Янкі Купалы яна аддала дарэшты сваё кіпучае жыццё.

Нялёгка было арганізоўваць музей Я. Купалы. Дом паэта, а разам з ім і ўвесь скарб—рукапісы, звыш 15 тысяч кніг—згарэлі ў першыя дні фашысцкай навалы. І ўсё ж Уладзіслава Францаўна са сваімі памочнікамі па крупінцы, любоўна, рупна і ашчадна збірала адусюль матэрыялы, звязаныя з дзейнасцю вялікага песняра.

Сціплая ў працы і ў быце, Уладзіслава Францаўна пра сябе звычайна змоўчвала. Ніхто з супрацоўнікаў музея ніколі ад яе не чуў, скажам, пра ўрадавыя ўзнагароды... Хіба толькі дзе ў анкеце можна было прачытаць, што мела два ордэны «Знак Пашаны», медалі, граматы. Нават прысуджэнне звання заслужанага дзеяча культуры БССР было ўспрынята ёю з унутраным хваляваннем і знешнім спакоем, з усведамленнем быццам бы нязначнасці сваіх заслуг перад народам.

У апошнія гады цёця Уладзя моцна хварэла. Часам яна скардзілася на стомленасць. Але дарэмнымі былі прапановы сяброў пайсці на ганаровы адпачынак, пазбавіцца працоўных турботаў.

Аднаго разу яна сказала: «Ну, мусіць, заўтра я не прыйду». Назаўтра цёця Уладзя не прыйшла. У гэты дзень яе не стала. Здарылася такое 25 лютага 1960 года...

Хораша сказаў пра Літаратурны музей Янкі Купалы Кастусь Цвірка:

Ледзь крануўся я клямкі дзвярэй,
І рука задрыжала,
Нібы гэта зусім не музей,
А кватэра Купалы...

І хоць тут не сустрэўся я з ім,
Знаю: з родным народам
Ён па краі ідзе дарагім
Малады, як заўсёды.

А побач з паэтам—маладая, як заўсёды, бадзёрая і няўрымслівая Уладзіслава Францаўна.

Іван КУРБЕКА.

Шматгадовая шчырая дружба звязвала гэтых дзвюх выдатных жанчын—Канстанцыю БУЙЛО (злева) і Уладзіславу Францаўну ЛУЦЭВІЧ.

КЕРАМІКА ПІКАСО Ў МІНСКУ

Гарадок Валарыс, што на поўдні Францыі, славіцца сваімі ганчарнымі майстэрнямі. Тут, на Лазурным беразе, пасля заканчэння другой сусветнай вайны некаторы час жыў і тварыў выдатны мастак Пабло Пікасо.

Невычэрпны выдумшчык і вынаходнік, ён няспынна займаўся пошукам новых форм, вобразаў, выяўленчых сродкаў. Падобна майстрам Адраджэння, браўся за многае: пісаў карціны, ляпіў, ілюстраваў кнігі, рабіў дэкарацыі для балетаў... І, напэўна, не выпадкова, што мастак звярнуўся да аднаго з самых старажытных і жыццярадасных мастацтваў усіх часоў і народаў.

Пікасо месяцамі сядзеў у старадаўняй капліцы, распісваючы насценны трыпціх «Вайна і мір», а яшчэ — працаваў у ганчарнай майстэрні, выраблаючы керамічныя талеркі са сваімі малюнкамі, пано і насценныя пліты. У роспісу па кераміцы, як правіла, тыя ж сюжэты, што і ў яго графічных работах: жанравыя сцэнкі, сцэны бою быкоў, партрэты, галубкі. Захоплены пошукам гармоніі формы і роспісу, ён стварыў больш за дзве тысячы работ.

У Беларускім дзяржаўным мастацкім музеі БССР цяпер экспануецца невялікая, але вельмі цікавая калекцыя керамікі Пікасо. Яе падарыла музею мадам Лежэ.

Т. ШПАРТАВА.

ДЗЕСЯЦЬ ЛЕПШЫХ СПАРТСМЕНАЎ ГОДА

Напэўна, паважаныя суайчыннікі, большасць з гэтых спартсменаў вы добра ведаеце. Пра адных мы пісалі ў сваёй газеце, змяшчалі іх фатаграфіі. Выступленні іншых вам пашчасціла бачыць непасрэдна на стадыёнах у час Алімпіяд, чэмпіянатаў свету, Еўропы, буйных міжнародных спаборніцтваў.

Сярод соцень выдатных спартсменаў Беларусі, якія дамагліся вялікага поспеху ў мінулагодніх спаборніцтвах самага высокага рангу, па традыцыі напярэдадні Новага года журналісты і аматары спорту назвалі дзесяць лепшых. Вось іх імёны.



1. **Уладзімір ПАРФЯНОВІЧ.** У 1978 годзе ён упершыню заваяваў сярэбраны медаль на чэмпіянаце свету. З таго часу вясляр-байдарачнік не прайграў ніводнага спаборніцтва. Напомнім нашым чытачам галоўныя з іх.

Алімпіяда-80. Тройчы на грабным канале ў Крылацкім паднімаўся мінчанін на вышэйшую прыступку п'едэстала гонару. Столькі ж — на леташнім чэмпіянаце свету ў Лондане. Хто яшчэ мае столькі вышэйшых узнагарод! Заслужаны майстар спорту СССР Уладзімір Парфяновіч увайшоў таксама ў дзесятку мацнейшых спартсменаў Савецкага Саюза па выніках мінулага года.

2. **Ігар КАНЫГІН.** Барацьба — не нацыянальны від спорту ў Беларусі. Але рэспубліка заўсёды славілася асілкамі. Такімі, як Алег Караваеў, Уладзімір Зубкоў... Цяпер на спартыўным небасхіле ўзышла новая зорка: віцябчанін Ігар Каныгін. Самага высокага поспеху ён дамогся летась у Осла, дзе стаў чэмпіёнам свету сярод барцоў вольнага стылю ў вазе да 90 кілаграмаў. Ігар Каныгін — прызёр Алімпіяды-80.

3. **Павел СУТ.** На апошнім, 1981 года, першынстве свету па спартыўнай гімнастыцы, якое прайшло ў кастрычніку ў Маскве, дэбютаваў у складзе зборнай каманды СССР. Навічок упэўнена выканаў практыкаванні на ўсіх снарадах. Гэтым унёс вялікі ўклад у агульнакамандную перамогу зборнай краіны на такіх адказных спаборніцтвах.

Да таго ж Павел Сут мае залаты медаль за камандную перамогу на чэмпіянаце Савецкага Саюза.

4. **Аляксандр ПАРТНОЎ.** Перад Алімпіядай-80 у яго заставаўся бадай што апошні шанц — міжнародны турнір па скачках у ваду «Веснавыя ластаўкі». Аляксандр добра разумеў: каб паехаць на Гульні ў Маскву, трэба абавязкова перамагчы. Затым мінчанін бліскуча выступае на Алімпіядзе-80. Праз год зноў выйграе міжнародны турнір «Веснавыя ластаўкі» і, нарэшце, «прывозіць» з югаслаўскага горада Спліта залаты медаль чэмпіёна Еўропы.

5. **Юрый ТОРБЕК.** Ён — адкрыццё мінулагодняга спартыўнага сезона. Увайшоў у вялікі спорт неяк адразу, але рашуча зацвердзіў сваё «я». Дамогшыся поспеху ў адборачным усесаюзным турніры, баксёр з Гомеля атрымаў пуцёўку ў Тампера на першынство Еўропы. Вярнуўся дэбютант з залатым медалём. Свой высокі клас валявы спартсмен пацвердзіў летась яшчэ раз, калі стаў сярэбраным прызёрам Кубка свету па боксу.

6. **Аляксандр РАМАНЬКОЎ.** Сваё «штатнае» месца ў дзесятцы лепшых заняў старэйшы фехтавальшчык краіны. На працягу многіх гадоў заслужаны майстар спорту, неаднаразовы чэмпіён Алімпійскіх гульняў, свету, кантынента ўваходзіць у склад зборнай каманды Савецкага Саюза.

Шмат каго здзіўляе спартыўнае даўгалецце гэтага чалавека. У мінулым сезоне вопытны рапірыст фехтаваў, як і ў свае маладыя гады: заваяваў залаты медаль чэмпіёна СССР, а пасля выйграў і Кубак краіны.

7. **Леанід ТАРАНЕНКА.** Мінулагодні спартыўны сезон беларускі штангіст завяршыў устанаўленнем двух сусветных рэкордаў. У Запарожжы ён упэўнена выйграў Кубак Савецкага Саюза. А да гэтага алімпійскі чэмпіён перамог у Казані на мемарыяле А. Курынава, дзе тройчы ўносіў папраўкі ў табліцу сусветных рэкордаў.

8. **Алена ПАЛЯВАЯ.** Пастаяннае прадстаўніцтва беларускіх гімнастак у зборнай камандзе Савецкага Саюза стала ўжо добрай традыцыяй. Вось і на апошнім чэмпіянаце свету, які прайшоў у кастрычніку 1981 года ў Маскве, гонар зборнай каманды краіны абараняла гамяльчанка Алена Палявая. Яна заняла другое месца ў многабор'і і была ўзнагароджана залатым медалём за агульнакамандную перамогу.

9. **Аляксандр КАРШАКЕВІЧ.** У кожнай камандзе па гульневых відах спорту ёсць свой запявала, або, як кажуць, дырыжор. Такую ролю ў гандбалістаў мінскага СКА і ў зборнай СССР «выконвае» Аляксандр Каршакевіч. Не было выпадку, каб ён пакідаў пляцоўку без закінутых мячоў.

Аляксандр Каршакевіч — сярэбраны прызёр Алімпіяды-80, залаты медаліст чэмпіянатаў свету і СССР, двухразовы ўладальнік Кубка краіны.

10. **Алена ХЛОПЦАВА.** На апошнім чэмпіянаце свету (верасень 1981 года, Мюнхен) мінчанка заваявала свой чарговы медаль па акадэмічнай грэблі ў складзе чацвёркі з рулявой. А яшчэ раней на Маскоўскіх Гульнях была мацнейшай у двойцы парнай. Яна з'яўляецца самай тытулаванай у Беларусі спартсменкай па акадэмічнай грэблі.



У вашу калекцыю

ПРЫСВЕЧАНА ЗНАМЯНАЛЬНЫМ ДАТАМ

Міністэрства сувязі СССР выпусціла некалькі паштовых марак, прысвечаных знамянальным падзеям у палітычным і культурным жыцці нашай краіны. Арыгінальная мініяцюра адзначае 25-годдзе Савецкага камітэта ветэранаў вайны. Гэта арганізацыя аб'ядноўвае грамадзян СССР, якія актыўна ўдзельнічалі ў абароне Савецкай дзяржавы ў радах Узброеных Сіл, партызанскіх атрадах і іншых фарміраваннях. Камітэт вядзе вялікую работу па патрыятычнаму выхаванню мас, па ўмацаванню сувязей з замежнымі арганізацыямі, якія змагаюцца супраць пагрозы вайны. Ён з'яўляецца членам Міжнароднай федэрацыі ўдзельнікаў руху Супраціўлення. На паштовым знаку на фоне сімвалічнага шчыта адлюстравана фігура воіна-вызваліцеля — галоўны манумент помніка-ансамбля воінам Савецкай Арміі ў Трэптаў-парку ў Берліне.

Адзначылі сваё 60-годдзе Аўтаномныя Савецкія Сацыялістычныя Рэспублікі — Комі і Кабардзіна-Балкарская. На паштовых марках, прысвечаных гэтым юбілеям, паказаны індустрыяльныя панарамы, што сімвалізуюць поспехі рэспублік за гады Савецкай улады.

150-годдзе з дня нараджэння І. Ульянава — рускага дэмакрата, педагога, выдатнага дзеяча народнай асветы, бацькі вялікага Леніна, савецкая пошта адзначыла памятнай маркай з партрэтам І. Ульянава.

Цікавы канверт, прысвечаны савецкай гвардыі. На ім — малюнак манумента ў гонар воінаў і надпіс: «40 гадоў савецкай гвардыі. г. Ельня. Манумент у гонар савецкай гвардыі, народжанай у баях пад Ельняй у 1941 годзе».

У сувязі з дваццацігоддзем Савецкага фонду міру выдадзены канверт з малюнкам зямнога шара, акаймаванага аліўкавай галінкай і кнігай, на старонках якой напісана: «Добраахвотны ўзнос у Фонд міру— праява асабістага клопату савецкага чалавека аб міры, аб шчасці, аб будучыні».

Споўнілася 10 гадоў праграмы ЮНЕСКА «Чалавек і біясфера» (МАБ). Міністэрства сувязі СССР адзначыла гэты юбілей выпускам паштовай карткі з маркай арыгінальнага малюнка, на якім паказаны сучасны горад на фоне ліста дрэва і эмблемы МАБ. На паштовай картцы дадзена эмблема ЮНЕСКА.

Л. КОЛАСАЎ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС:
МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80; 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Зак. 75